# Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі дадзены старт практычнай рэалізацыі праекта «Разумныя Гарады Беларусі»

Разам з зацвярджэннем 2 лютага 2021 года Дзяржаўнай праграмы «Лічбавае развіццё Беларусі» на 2021-2025 гады дадзены старт новаму этапу рэалізацыі комплекснага праекта рэспубліканскага маштабу «Разумныя Гарады Беларусі» - сістэмнаму пераходу ў практычную плоскасць.

Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі ў партнёрстве з Мінгарвыканкамам пачата рэалізацыя праекта па стварэнні рэгіянальнай дзяржаўнай тыпавой лічбавай платформы «Разумны горад (рэгіён)», стварэнні і развіцці комплексу тыпавых сэрвісаў па асноўных напрамках і сферах функцыянавання гарадоў.

Кансалідаваны тэарэтычныя і практычныя кампетэнцыі:

- Нацыянальнага інфраструктурнага аператара РУП «Белтэлекам» па развіцці нацыянальнай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры, паслуг, якія аказваюцца на яе аснове;
- КУП «Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама» паспяхова рэалізуе не толькі ў Мінску, але і на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі маштабныя «разумныя» рашэнні;
- ААТ «Гіпрасувязь», якое забяспечвае навуковае суправаджэнне рэалізацыі праекта «Разумныя гарады Беларусі».

Работа праводзіцца ва ўзаемадзеянні з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

З улікам створаных ў Рэспубліцы сур'ёзных інфраструктурных напрацовак на пяцігадовы перыяд вызначаны шэраг сістэмаўтваральных мерапрыемстваў для развіцця тэхналогій «разумных гарадоў» ва ўсіх рэгіёнах краіны:

- стварэнне рэгіянальнай дзяржаўнай тыпавой лічбавай платформы «разумны горад (рэгіён)» і яе маштабаванне шляхам адаптацыі і ўкаранення ў першую чаргу ў абласных цэнтрах і адзінаццаці гарадах (раёнах) краіны з колькасцю больш за 80 тыс. чалавек насельніцтва, вызначаных патэнцыяльнымі цэнтрамі эканамічнага росту (гарады Орша, Баранавічы, Пінск, Наваполацк, Полацк, Мазыр, Ліда, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Бабруйск);
- стварэнне нацыянальнага геапартала;
- развіццё рэгіянальнай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры;
- стварэнне і развіццё тыпавых сэрвісаў у розных сферах жыцця гарадоў з наступным іх маштабаваннем

.

У выніку паслядоўнай рэалізацыі праекта «Разумныя гарады Беларусі» будзе забяспечана пабудова сучаснай сістэмы кіравання рэгіёнамі як базіса для правядзення мерапрыемстваў па

комплекснай лічбавай трансфармацыі эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/10-03-2021-7083*